УДК 39: 688. 721: 598.2 (= 826)+745/749. 042.1 (476)

# СЕМАНТЫКА ВОБРАЗА ПТУШКІ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ЦАЦЦЫ

Касцюкевіч С.У., асп.

*Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, Мінск*

Беларуская народная цацка мае абмежаванае кола сюжэтаў. Сярод іх найбольш часта сустракаюцца выявы птушак. Традыцыйнымі вобразамі ў народнай цаццы з'яўляюцца качка і певень.

Птушка – сімвал душы чалавека. У беларускай міфалогіі рай называецца выраем. “У некаторых міфалагічных традыцыях ёсць выявы птушак з галовамі чалавека” [1]. Сярод цацак у выглядзе птушак сустракаюцца выявы паўконей-паўптушак, на якія ў свой час звярнуў увагу акадэмік Рыбакоў Б.А. Ён лічыў іх старажытнымі славянскімі салярнымі сімваламі [2].

У аснове міфалагічнага вобраза пеўня знаходзіцца яго сувязь з сонцам. Гэты вобраз таксама цесна звязаны з упарадкаваннем часавай прасторы. Певень, як і сонца “адкрывае” для чалавека час фізічнай актыўнасці (“з першымі пеўнямі”), таму з ім звязаны найбольш светлыя асацыяцыі. Вобраз пеўня дастаткова шырока прадстаўлены ў народнай цаццы (гэта свістулька-певень ў беларусаў і рускіх, “пан Твардоўскі на когуце” ў палякаў і г.д.). У культуры некаторых народаў певень мае рысы антрапаморфнасці. Так, “аўстралійскія абарыгены называюць пеўня птушкай, якая смяецца на досвітку, надаючы такім чынам пеўню чалавечыя рысы. У большасці народаў певень звязаны з боствамі ранешняй зары і сонцам, нябеснага агню, з'яўляецца свяшчэннай ці ахвярнай птушкай (у Апалона, Мітры, Ахурамазды, Аматэрасу, Меркурыя, Марса і г.д.)” [1]. Певень – гэта праваднік сонца на яго шляху. Цікава адзначыць, што ў беларускай народнай цаццы найбольш распаўсюджаны колер свістулек-пеўнікаў гэта чырвоны. Певень, прынесены ў ахвяру, павінен выклікаць выздараўленне.

“У сярэднявеччы певень набыў асаблівую важнасць для хрысціян, якія амаль заўсёды размяшчалі яго на флюгеры ці на высокай вежы ратушы, як алегорыю пільнасці і ўваскрасення. Даві адзначае, што пільнасць у гэтым кантэксце павінна трактавацца ў сэнсе імкнення да бессмяротнасці і клопату аб першынстве духоўнага” [1].

Рускі даследчык Афанасьеў А.Н. прыводзіць шмат сведчанняў узгадвання звышнатуральных якасцяў птушкі, прыпісваемых ёй славянскім фальклорам. Ён лічыць, “што птушка ўвасабляла сабой не толькі сувязь з нябеснай сферай, але і сонечнае святло, стыхіі, маланку, аблокі, хуткасць чалавечага розуму” [3].

Мяркуючы па археалагічных дадзеных, матыў вадаплаваючай птушкі шырока выкарыстоўваўся яшчэ ў неалітычную эпоху. На керамічным посудзе з розных месцаў Еўропы сустракаецца арнамент у выглядзе гусіных лапак [4]. Гліняная качачка – распаўсюджаная археалагічная знаходка. У сховішчах музееў захоўваецца шмат цацак гэтай групы, якія паходзяць з тэрыторыі Беларусі. Цікава, што незалежна ад даціроўкі гліняныя качачкі маюць падобныя рысы, тэхналогія іх вырабу амаль не змянілася. У Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку захоўваюцца качачкі-свістулькі, знойдзеныя пад час археалагічных раскопак у Полацку. Па стылістыцы выканання яны вельмі падобны. Вось апісанне цацкі, датаванай XII-XIII стст.: “цацка-качка з кропкавым і хвалістым арнаментам. Памеры: 4,0×11,0×5,0 см. Знойдзена ў 1985 г.” [5]. Апісанне цацак-качачак XVII-XVIII стст. вельмі падобна да вышэй прыведзенага. Сучасныя майстры-цацачнікі таксама вырабляюць свістулькі-качкі. Аднолькавымі засталіся тэхналагічныя прыёмы, памеры, афарбоўка. Афарбоўка гліняных птушак залежала ад спосабаў дэкаратыўнай апрацоўкі керамікі, прынятых у дадзенай мясцовасці [6]. Беларускія цацкі-птушкі захоўваюцца ў Расійскім этнаграфічным музеі ў Санкт-Пецярбургу. Амаль у кожнай калекцыі цацак з тэрыторыі Беларусі прысутнічаюць пеўнікі, качкі ці стылізаваныя выявы птушак. Пры апісанні калекцыі № 5052 зафіксавана цікавая мясцовая назва цацкі ў выглядзе пеўніка – “пявун”. Цацка з такой назвай трапіла ў калекцыю дзякуючы збіральніцкай працы Сержпутоўскага А.К. у ваколіцах г. Гомеля ў 1929 г. Цікава тое, што ў вопісе адзначана, што “цацка дзіцячай работы”[7]. Часам цацка размалёўвалася каляровай палівай, як, напрыклад цацка-певень з калекцыі № 4934/Д: “гліняная, на круглай падстаўцы, пакрыта светла-зялёнай палівай” [8]. У калекцыі № 4164 значацца два “пеўнікі” і дзве “курачкі” [9]. Геаграфія распаўсюджання птушак цацак вельмі шырокая. На Беларусі яны былі распаўсюджаны паўсюль. Цацкі з Віцебшчыны часцей за ўсё глазураваныя. Так, “птушка” з калекцыі № 3026, сабранай Сержпутоўскім А.К. у 1914 г. у Полацкім павеце ў вёсцы Белае “пакрытая карычневай палівай” [10]. Часам мясцовае насельніцтва называла цацкі свістулькі “свістунамі,” пры зборах калекцый этнографы XIX ст. гэта засведчылі ў апісаннях ці кнігах паступленняў музейных калекцый [11].

У сімволіцы птушак ёсць дваістасць. “У міфах і легендах розных народаў свету сустракаюцца птушка радасці і птушка смутку ( Алканост і Сірын ), белы і чорны воран, залаты і чорны певень, птушкі дня і ночы. Міфалагічныя птушкі адлюстроўваюць самыя старажытныя пласты прадгісторыі. Яны ўвасабляюць прыродныя і касмічныя сілы, выступаюць у ролі дэміургаў побач з багамі і нават да іх

нараджэння (Страцім-Лебядзь), захоўваюць таямніцы свету, ведаюць мінулае, цяперашняе і будучае Зямлі і Космасу. Самая таямнічая і загадкавая птушка славянскай міфалогіі – Страцім – нават не мела адлюстравання. Яна , як і індаеўрапейская Гаруда, была прарадзіцельніцай і ўладарніцай над ўсімі птушкамі. Жыла Страцім-птушка пасярод мора-акіяна, як і персідская Рух кіравала вятрамі і бурамі, на ноч хавала пад крыло Сонца, ратуючы яго ад ўсяленскіх бедстваў, магла хаваць і зямлю” [12].

Некаторымі даследчыкамі выказваецца думка, што птушкі былі боствамі ці татэмамі некаторых родаў. “Неаднолькавыя адносіны да розных відаў птушак былі абумоўлены звычаямі таго рода, які лічыў сябе звязаным з дадзеным відам птушак” [13]. Безумоўна, качку звязвалі з “тым” светам, але сутнасць дадзенай сувязі да канца не разгадана. У народным мастацтве качка сустракаецца не толькі ў цаццы, але і ў аздобе ўнутранага інтэр’ера сялянскай хаты. Нікольскі Н.М. адзначае, што падобныя выявы выконвалі апатрапейную функцыю [14].

Цікавасць прадстаўляюць не толькі гліняныя цацкі-качкі, але і цацкі з іншых матэрыялаў. У калекцыі №1292, сабранай Мілерам А.А. для Этнаграфічнага аддзела Рускага Музея Імператара Аляксандра III у 1908 г. ёсць такая цацка з дрэва. Яна знойдзена ў вёсцы Лобанаўка Чэрыкаўскага ўезда Магілёўскай губерніі. Прадстаўляе сабой цацку з дрэва, спінка якой плоская, хвост паўкруглы, ног не мае. Даўжыня фігуркі 16 см. У кнізе паступленняў значыцца пад назвай “вуточка” [15]. На Беларусі сустракаюцца драўляныя птахі, зробленыя з тоненькіх дошчачак. Звычайна такіх птахаў падвешвалі пад столь, дзе яны лунaлі пад уздзеяннем скрызняка. Такія птахі захаваліся з XIX-XX стст. Больш ранніх вырабаў падобнага роду на Беларусі няма, аднак, можна меркаваць, што яны былі распаўсюджаны і раней, паколькі існуюць у суседніх народаў. Тое ж можна сказаць і аб іншых відах драўлянай цацкі. Паўсюдна распаўсюджанымі народнымі цацкамі з’яўляюцца ў Польшчы “птахі-клепакі.” Гэта асаблівы від “трашчотак,” які ўяўляе сабой цацку ў выглядзе птушкі на колцах з прымацаванай даўгой палачкай. Крылы птахаў пры дапамозе дроту прымацаваны да колцаў так, што калі дзіця, трымаючыся за палку цягне цацку па зямлі, крылы пачынаюць біцца адно аб другое, утвараючы моцны гук – клёкат. Адсюль і назва цацак. Пры роспісе цацак польскія майстры выкарыстоўвалі анілавыя фарбы [16].

Пры раскопках курганаў VIII ст. ля вёскі Боркі Полацкага раёна знойдзена шмат касцяных качачак, а ў курганах IX-X ст.ст. ля вёскі Рудня таго ж раёна – касцяная галава каня з рэльефнай упражжу. У народным мастацтве часта сустракаецца выява птушкі, многія даследчыкі сыходзяцца на думцы, што падобныя выявы з’яўляюцца адгалоскам дахрысціянскіх часоў, злёгку прыкрытым хрысціянскай сімволікай [17].

У Польшчы меў хаджэнне яшчэ ў 1911 годзе народны апокрыф, заснаваны на сярэднявечнай традыцыі, які тлумачыць выраб цацак у выглядзе птушак тым, што яшчэ сам Езус, калі быў малым дзіцём, гуляў у такія цацкі. Ляпіў ён сабе цацкі з гразі на вуліцы, як часта гэта робяць і звычайныя дзеці, але аднойчы, зрабіўшы птушку, выпадкова чыхнуў на яе, і тая ажыла, паляцела ў неба [18]. З аднаго боку, дадзеная легенда можа трактавацца як спроба надаць сакральнае адценне “несур’ёзнаму” занятку і, такім чынам, апраўдаць яго існаванне. З іншага боку, леген-

да, магчыма стала хрысціянскім покрывам для больш архаічнага, але моцна трымаўшагася звычая [19].

На Беларусі засведчаны больш архаічныя звычаі. “На Палессі пеўня закопвалі жыўцом на двары, каб перапыніць падзеж скаціны па сведчанні А.К.Сержпутоўскага. Звычай той ёсць яшчэ адно падцверджанне сакральнай ролі пеўня” [20]. Сувязь паміж вобразам ў народнай міфалогіі і паэзіі з беларускай народнай цацкай відавочна.

## Літаратура


1. Керлот Х.Э. Словарь символов. / Пер. Н.А. Богун и др. – Москва: REFL-book, 1994. – С. 424.
2. Рыбаков Б.А. Прикладное искусство и скульптура // История культуры древней Руси. - М.-Л., 1951. - Т.2. – С. 397.
3. Афанасьев А.Н. Поэтические воззрения славян на природу. Опыт сравнительного изучения слав. преданий и верований в связи с миф. сказаниями других родственных народов. В 3-х т. Т.1. М.: Соврем. писатель, 1995. – С. 113.
4. Грибова Л.С. Пермский звериный стиль. – М.: Наука, 1975. – С. 85.
5. Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік – КП-2 – 1572.
6. Сахута Я.М. Народнае мастацтва Беларусі. - Мн.: «Полымя», 1997 – С. 126.
7. Расійскі этнаграфічны музей – КП – 5052-1.
8. Расійскі этнаграфічны музей – КП – 4934/Д.
9. Расійскі этнаграфічны музей – КП – 4146.
10. Расійскі этнаграфічны музей – КП – 3026.
11. Расійскі этнаграфічны музей – КП – 2542-1/4.
12. Шамякіна Т.І. Беларуская класічная літаратура і міфалогія. – Мн.: БДУ, 2001. – С. 152.
13. Афанасьев А.Н. Поэтические воззрения славян на природу. Опыт сравнительного изучения слав. преданий и верований в связи с миф. сказаниями других родственных народов. В 3-х т. Т.1. М.: Соврем. писатель, 1995. – С. 121.
14. Нікольскі Н.М. Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераваннях беларускага сялянства // Працы секцыі этнаграфіі. - Мн., 1933. - Вып.3. – С. 18.
15. Расійскі этнаграфічны музей – КП – 1292-119.
16. Seweryn T. Polskie zabawki ludowe. – Warszawa, 1960. – S. 56.
17. Леонова А.К. Народная деревянная скульптура Белоруссии. Краткий очерк. – Мн.: Наука и техника – 1977. – С. 7.
18. Lewinska T. Kolorowy świat zabawek. Zabawki ludowe w Polsce. Muzeum zabawkarstwa w Kielcach. // Studia i Materiały. - Kielce. 1995. – S. 46.
19. Seweryn T. Polskie zabawki ludowe. – Warszawa, 1960. – S. 31.
20. Журавлев А.Ф. Домашний скот в поверьях и магии восточных славян. Этнографические и этнолингвистические очерки. - М.: Изд-во «Индрик», 1994. – С. 113.